Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2018;3:120–126
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2018;3:120–126

*УДК 81'373.2:811.161.3*

# СПОСОБЫ ОБРАЗОВАНИЯ ОНОМАСТИЧЕСКИХ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ (НА МАТЕРИАЛЕ БЕЛОРУССКОГО ЯЗЫКА)

***Н. А. ЛЕВЧЕНКО***[1)]

[1)]*Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, ул. Э. Ожешко, 22, 230023, г. Гродно, Беларусь*

На материале белорусского языка исследуются механизмы фразеообразования в сфере ономастической фразеологии. Установлено, что наиболее продуктивным способом фразеообразования является фразеолого-синтаксический. Отмечается, что основными способами актуализации внутренней формы фразеологизмов выступают метафорический и метонимический переносы. Выявлено, что путем экспликации образуются сочетания с псевдособственными именами, подавляющее большинство которых являются эвфемистическими фразеологизмами. Определены основные разновидности фразеообразования в рамках собственно фразеологического способа образования. Установлено, что ономастические фразеологизмы могут образовываться в результате эллипсиса пословицы. Отмечается, что образование фразеологизмов с компонентом – именем собственным обусловлено лингвистическими и экстралингвистическими факторами.

***Ключевые слова:*** фразеологизм; ономастический компонент; метафорическое переосмысление; метонимическое переосмысление; гипербола; персонификация; псевдооним; перифраза; фразеологизм-эвфемизм; эллипсис.

# СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ АНАМАСТЫЧНЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ)

***Н. А. ЛЕЎЧАНКА***[1*]

[1*]*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, вул. Э. Ажэшка, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь*

На матэрыяле беларускай мовы даследуюцца механізмы фразеаўтварэння ў сферы анамастычнай фразеалогіі. Вызначана, што найбольш прадуктыўным спосабам фразеаўтварэння з'яўляецца фразеалагічна-сінтаксічны. Паказана, што асноўнымі спосабамі актуалізацыі ўнутранай формы фразеалагізмаў выступаюць метафарычны і метанімічны пераносы. Выяўлена, што шляхам эксплікацыі ўтвараюцца выразы з псеўдаўласнымі імёнамі, пераважная большасць якіх з'яўляюцца эўфемістычнымі фразеалагізмамі. Акрэслены асноўныя разнавіднасці фразеаўтварэння ў межах унутрыфразеалагічнага спосабу. Сцвярджаецца, што анамастычныя фразеалагізмы могуць утварацца ў выніку эліпсіса прыказкі. Адзначаецца, што ўтварэнне фразеалагізмаў з кампанентам – уласным імем абумоўлена лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі фактарамі.

***Ключавыя словы:*** фразеалагізм; анамастычны кампанент; метафарычнае пераасэнсаванне; метанімічнае пераасэнсаванне; гіпербала; персаніфікацыя; псеўдаонім; перыфраза; фразеалагізм-эўфемізм; эліпсіс.

**Образец цитирования:**
Леўчанка НА. Спосабы ўтварэння анамастычных фразеалагізмаў (на матэрыяле беларускай мовы). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія*. 2018;3:120–126.

**For citation:**
Leuchanka NA. Ways of formation of onomastic phraseological units (on the material of the Belarusian language). *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2018;3:120–126. Belarusian.

**Автор:**
***Наталья Александровна Левченко*** – аспирантка кафедры белорусской филологии филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Н. А. Данилович.

**Author:**
***Natalia A. Leuchanka***, postgraduate student at the department of Belarusian philology, faculty of philology.
*natalia-alex21@yandex.ru*

# WAYS OF FORMATION OF ONOMASTIC PHRASEOLOGICAL UNITS (ON THE MATERIAL OF THE BELARUSIAN LANGUAGE)

*N. A. LEUCHANKA*[a]

[a]*Janka Kupala State University of Hrodna, 22 E. Ažeška Street, Hrodna 230023, Belarus*

The paper is devoted to the study of mechanisms of onomastic phraseological units derivation in the Belarusian language. The analysis showed that the most productive way of phraseologism formation is the phraseological-syntactical one. The main methods of renewing the inner form of idioms are metaphor and metonymy. Pseudoproper names are formed due to explication. The main mechanisms of phraseologism formation within the inner phraseological method are estimated. It is established that onomastic phraseological units can be formed as a result of ellipsis of proverbs. It is noted that the formation of phraseological units with the onomastic component is due to linguistic and extralinguistic factors.

***Key words:*** phraseological unit; onomastic component; metaphor; metonymy; hyperbole; personification; pseudoproper name; periphrasis; euphemism; ellipsis.

Праблема фразеаўтварэння – адна з цэнтральных у фразеалогіі. Ёю займаліся такія вядомыя вучоныя, як Ю. А. Гваздароў, А. М. Ермакова, У. І. Коваль, Н. С. Лалаян, І. Я. Лепешаў, В. М. Макіенка, У. Д. Ужчанка, Ю. А. Фірсава і інш.

Яшчэ ў пачатку станаўлення фразеалагічнай навукі Н. М. Амосава адзначала: «Назіранні над формамі функцыянавання фразеалагічных адзінак, над семантычнымі сувязямі паміж іх кампанентамі, над выпадкамі вылучэння аднаго з кампанентаў фразеалагічнай адзінкі, з узнікшым у выніку такога вылучэння зрухам яго семантыкі пад уздзеяннем цэласнага значэння зыходнага слоўнага комплексу – адкрываюць перад даследчыкамі новы аспект праблемы пераасэнсавання слоў. І механізм яго аказваецца тут іншым, заснаваным не на супастаўленні дэнататаў, а на сувязях паміж самімі словамі; і прычыны яго аказваюцца не экстралінгвістычнымі, а інтралінгвістычнымі»[1] [1, с. 8].

Даследчыкі заўважылі, што «ўтварэнне фразеалагізмаў падпарадкавана аб'ектыўным заканамернасцям мовы» [2, с. 6] і «для апісання фразеаўтваральнага працэсу неабходна выяўляць, на базе якога матэрыялу і пад уплывам якіх прычын узнікае новая фразеалагічная адзінка» [3, с. 20].

Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца класіфікацыя і характарыстыка спосабаў утварэння фразеалагізмаў з анамастычным кампанентам у беларускай мове.

Аб'ектам даследавання сталі фразеалагізмы з уласным імем і кампанентам-ад'ектонімам, выяўленыя метадам суцэльнай выбаркі з фразеалагічных і лексічных слоўнікаў беларускай літаратурнай і дыялектнай мовы, фальклорных і лінгвістычных зборнікаў, картатэкі «Фразеалагічнага слоўніка Гродзеншчыны».

Найбольш прадуктыўным, паводле назіранняў У. І. Коваля, з'яўляецца першаснае фразеаўтварэнне [2, с. 7], або, у тэрміналогіі А. М. Ермаковай, «знешняе фразеаўтварэнне», у межах якога вылучаюцца фразеалагічна-сінтаксічны і фразеалагічна-лексічны спосабы. Сутнасць першага з іх заключаецца ў тым, што ўтварэнне фразеалагізмаў адбываецца на аснове сінтаксічных адзінак (свабодных словазлучэнняў і састаўных тэрмінаў) у выніку іх пераасэнсавання [4, с. 17].

Утварэнне фразеалагізмаў «рэгулюецца» іх унутранай формай [5, с. 112]. Пад унутранай формай разумеецца «вобраз, які ляжыць у аснове фразеалагізма, "вобразнае ўяўленне, якое спадарожнічае значэнню" (В. У. Вінаградаў) фразеалагічнай адзінкі» [6, с. 26]. Даследчык В. І. Зімін вызначае ўнутраную форму як «сувязь, якая існуе паміж фразеалагічным значэннем звароту і рэальнымі (сучаснымі або гістарычнымі) значэннямі кампанентаў, якія складаюць выраз» [7, с. 85].

Асноўныя механізмы актуалізацыі ўнутранай формы фразеалагізмаў, якая служыць важнай крыніцай вобразнасці, – гэта метафарызацыя і метанімізацыя. Найбольш прадуктыўным механізмам з'яўляецца метафарычнае пераасэнсаванне – перанос назвы з адной з'явы на другую на аснове падабенства паміж імі [4, с. 17]. Так, фразеалагізм *заводзіць* (*завесці*) *катрынку* са значэннем 'дакучліва гаварыць пра адно і тое' (Ков., ФС) узнік у выніку метафарычнага пераасэнсавання свабоднага словазлучэння, звязанага з ігрой на катрынцы – «пераносным механічным аргане ў выглядзе невялікай скрынкі, на якім ігралі вандроўныя музыканты» [8, с. 37]. Калі заводзілі гэты музычны інструмент, чулася працяглае і нуднае гучанне, што і паслужыла асновай для пераасэнсавання значэння адпаведнага выразу. Першай мелодыяй, якая выконвалася вандроўнікамі-немцамі, была песня *Charmante Catherine* («Прыгожая Кацярына»). Ад другога кампанента гэтай назвы паходзіць апелятызаваны антрапонім *катрынка* [8, с. 37].

[1]Тут і далей пераклад наш. – *Н. Л.*

Паводле І. Я. Лепешава, «найбольшы “каэфіцыент вобразнасці” (У. П. Жукаў) маюць фразеалагізмы, якія могуць быць супрацьпастаўлены адпаведнаму свабоднаму словазлучэнню і на яго фоне ўспрымаюцца як разгорнутая метафара» [6, с. 27–28]. Так, унутраная форма фразеалагізма *божая кароўка* ‘1) жучок чырвонай, жоўтай або белай афарбоўкі з плямкамі; 2) ціхі, бяскрыўдны чалавек, які не ўмее пастаяць за сябе’ (СФ-1) становіцца зразумелай на фоне падабенства гэтага жучка з кароўкай: «…калі яго перавярнуць і пакратаць брушка, то на нагах у насякомага выступаюць ярка-ружовыя кроплі (“малачко”). Жучок зусім бяскрыўдны і безабаронны, што і стала падставай для развіцця ў фразеалагізме яшчэ аднаго значэння» (ЭСФ, с. 14). Вобразная аснова фразеалагізма *(стары) як Гродна* ‘вельмі (стары хто-н.), вельмі (старое што-н.)’[2] (СДФГ) пераасэнсоўваецца і прыводзіць да развіцця асацыяцый са старажытнасцю (Гродна – горад, першая пісьмовая згадка якога датуецца 1128 г.).

Разгледзім некаторыя анамастычныя выразы, утвораныя шляхам метафарычнага пераасэнсавання, вобразнасць якіх засноўваецца на рэальных сітуацыях. У гаворках Брэстчыны зафіксаваны выраз *(адзецца, апрануцца) як Амялян на Пакровы* (Зайка, ФСК). Аўтэнтычную этымалагічную даведку, дзякуючы якой вобразнасць фразеалагізма становіцца празрыстай, змясціў у сваім слоўніку А. Зайка: *Некалі жыў у вёсцы дзядзько на ймя Амялян. На Пакрову ён апрануўся па-сьвяточнаму, але ў адным пралічыўся: ні так, як трэба, зашпіліў пінжак. Вийшло адно крысо вышэй, а другоя ніжэй. С таго часу пайшла гэтая покаска* (Зайка). Падобным чынам утварыліся і наступныя фразеалагізмы: *(пагуляць) як Асей у студні* ‘зусім не (пагуляць)’ (НКАМ), *(спацець) як Аўгустын над кісялём* ‘вельмі (спацець)’ (КФСГ), *(збірацца) як Баўтрук да мадленя* ‘вельмі павольна, марудна’ (КФСГ), *(разысціся) як Ігналя на вечарынцы* ‘вельмі, празмерна (разысціся)’ (БНП, Высл.). Метафарычны перанос, які ляжыць у аснове значэнняў гэтых фразеалагізмаў, звязваецца з вядомымі рэальнымі жыццёвымі сітуацыямі, якія паслужылі крыніцай іх утварэння.

Метанімічны перанос заснаваны на сумежнасці дзвюх з’яў, якія непасрэдна звязаны адна з адной пастаяннымі адносінамі [4, с. 19]. Так, у выніку метанімічнага пераносу склаліся выразы, якія маюць тэмпаральную семантыку: *на святэй (святый)* Адам ‘ніколі’ (Юрч.-1974), *на польскія Акцябарскія* ‘невядома калі; ніколі’ (СДФГ), *<як> ад куцці да каляд* ‘нядоўга, кароткі прамежак часу’ (СДФГ).

Прасторавая семантыка рэалізуецца ў эўфемістычных фразеалагізмах са значэннем ‘хаваць, пахаваць (нябожчыка)’: *вынесці за Бэкіша* (КФСГ), *вынесці за Бэлька* (КФСГ), *вынесці за Трышын* (Янк.-1979), *вынесці за Пуціса* (КФСГ), *панесці пад Харытона* (КФСГ). Тут уласнае імя абазначае сядзібу гаспадара, за якой знаходзяцца могілкі.

Такім чынам, анамастычныя фразеалагізмы, якія з’яўляюцца метафарычнымі ці метанімічнымі ўтварэннямі, характарызуюцца яркай вобразнасцю, жывой унутранай формай.

Пры ўтварэнні фразеалагізмаў на метафарычныя ці метанімічныя пераносы часта накладваюцца іншыя сродкі моўнай выразнасці. Паводле І. Я. Лепешава, «амаль усе фразеалагізмы – своеасаблівыя, мастацкія мініяцюры», экспрэсіўнасць якіх ствараецца або «толькі эўфанічнымі прыёмамі, або ў сукупнасці з іншымі мастацкімі прыёмамі» [6, с. 31]. Найбольш пашыранымі сродкамі стварэння выразнасці ў анамастычнай фразеалогіі выступаюць гіпербала і персаніфікацыя.

Прывядзём прыклады фразеалагізмаў, вобразнасць якіх грунтуецца на гіпербале: *вярста каломенская* ‘чалавек вельмі высокага росту’ (СФ-1), *вавілонскае стоўпатварэнне* ‘поўная неразбяруха, беспарадак, гармідар’ (СФ-2), *(доўгі) як Алекшыцкая грэбля* ‘хто-н. вельмі высокага росту’ (Fed., Высл., БНП).

Дадатковым прыёмам утварэння фразеалагізмаў з анамастычным кампанентам можа выступаць персаніфікацыя, заснаваная на выкарыстанні ўласнага імя ў значэнні апелятыва: *іван-ды-мар’я* ‘травяністая трохколерная расліна сямейства фіялкавых; браткі’ (СФ-1), *Міцькам звалі* ‘хто-н. хутка знік, збег, схаваўся’ (СДФГ).

Вобразнасць многіх фразеалагізмаў з уласным імем падмацоўваецца рыфмай, якая выступае як сродак мастацкай выразнасці і прымае ўдзел пры іх утварэнні [9, с. 104]: *пашлі ў сваты да сляпой Агаты* [без тлумачэння] (Рап., ПП), *ні к Сідару ні к Хведару* ‘пра нязд атнага, няўмелага чалавека’ (Горл.-1975, Ков.), *ад Анаша да Кайпаша* ‘адаслаць з адной інстанцыі да іншай’ (Fed.), *(прыбрацца) як дама з Амсцердама* [без тлумачэння] (Высл.), *з Пінска да Мінска* ‘усюды’ (КФСГ), *Гуры Мацкі двор гервяцкі* ‘вялікую тэрыторыю, вялікую адлегласць (абысці, аб’ехаць)’ (СДФГ).

Анамастычныя фразеалагізмы могуць утварацца фразеалагічна-лексічным спосабам, гэта значыць на базе асобных слоў, напрыклад шляхам эксплікацыі, у выніку якой адбываецца «расшчапленне» пэўных лексем [2, с. 7]. Да гэтай групы належаць фразеалагізмы са штучна ўтворанымі ўласнымі імёнамі.

Даследчык У. І. Коваль адзначаў: «Найбольш “адкрытую” ўнутраную форму маюць фразеалагізмы, утвораныя ў выніку “разгортвання” слоў, якія з’яўляюцца іх дэрывацыйнай базай, ва ўстойлівае слова-

[2]Тут і далей напісанне і значэнні фразеалагізмаў, а таксама прыклады іх ужывання прыводзяцца ў адпаведнасці з іх афармленнем у крыніцах. – *Н. Л.*

злучэнне, якое ўключае ў свой склад няправільна арыентуючае ўласнае імя» [10, с. 162]. Так, у выразе *ажаніцца з Пясоцкім (Пясэцкім)* ‘памерці’ (СДФГ, ЗНФ) «зашыфраваны» вобраз смерці, які зыходзіць ад псеўдаўласнага імя *Пясоцкі (Пясэцкі)*, утворанага ад апелятыва пясок у значэнні ‘зямля, якой закопваюць магілу’. Штучнае прозвішча *Пясоцкі (Пясэцкі)* з’яўляецца звяном паміж дэнататам і «ілюзорнай» унутранай формай фразеалагізма, «намякае на яе несапраўднасць» [11, с. 42].

Спецыфіка псеўдаўласных імёнаў заключаецца ў тым, што «фармальна яны суадносяцца са словамі актыўнага слоўнікавага запасу, а ўнутрана, зместава яны, падпадаючы пад метафарызацыю… суадносяцца са сваёй дэрывацыйнай базай на аснове гукавога падабенства» [10, с. 161]. Фразеалагізм *чытаць Храпавіцкага* ‘моцна спаць, звычайна храпучы, пахрапваючы’ (СДФГ) утрымлівае гульню слоў, якая пабудавана на падабенстве ў гучанні антрапоніма *Храпавіцкі* і апелятыва *храп*. Выраз *адпраўляць у Магілёўскую губерню (каго)* (СФ-1) ‘забіваць, знішчаць’ набывае фразеалагічнае значэнне дзякуючы гукавому падабенству адтапонімнага прыметніка *магілёўскі* і назоўніка *магіла*.

Прывядзём яшчэ некалькі аналагічных прыкладаў: *хлеб з Тарбатова* ‘рэшткі яды, прывезенай дадому, якую прапануюць дзецям; зайцаў хлеб’ (Fed.) (*Тарбатова* < *торба*), *пайсці да Святога спаса* ‘памерці’ (Fed.) (*Спас* < *спасенне*), *Сасноўскі абнімае (каго)* ‘хіліць на сон каго-н.’ (СДФГ) (*Сасноўскі* < *сон*), *паехаць у Ложкаўцы* ‘заснуць, спаць’ (СДФГ) (*Ложкаўцы* < *ложак*), *пайсці за Клепацкага* ‘памерці’ (Fed.) (*Клепацкі* < *ляпаць* ‘забіваць накрыўку ў труне’), *выйсці замуж за Лапатэцкага* ‘памерці’ (КФСГ) (*Лапатэцкі* < *лапата*), *Галадніцкі ўбіўся ў хату* ‘няма чаго есці, наступіў голад’ (СДФГ) (*Галадніцкі* < *голад*).

Многія фразеалагізмы з анамастычным кампанентам з’яўляюцца эўфемістычнымі выразамі, якія ўтвараюцца ў выніку эксплікацыі перыфрастычнага тыпу. Даследчык В. П. Масквін тлумачыць тэрмін «эўфемізм» як «выкарыстанне слоўных зашыфровак з мэтай змякчыць, завуаляваць, прыгожа “спакаваць” прадмет паведамлення, пакінуўшы ўсё ж такі магчымасць любому носьбіту мовы здагадацца, пра што ідзе гаворка» [12, с. 60]. Падобнае вызначэнне сустракаем у працы Ю. С. Арсенцьевай, якая тлумачыць гэта паняцце як замену «слова або выразу, грубага, непрыстойнага па той ці іншай прычыне, словам або выразам мяккай або завуаліраванай канатацыі» [13, с. 5]. Даследчыца заўважае, што ўнутраная форма, вобраз, закладзеныя ў аснову значэння фразеалагізма, «з’яўляюцца прычынай змякчэння і вуаліравання падобных паняццяў, паколькі фразеалагізмы-эўфемізмы ў дадзеным выпадку выступаюць як спосабы непрамога, перыфрастычнага і змякчальнага абазначэння» [13, с. 7].

Інтэнсіўна эўфемізуецца значэнне ‘памерці’: *пайсці да Абрама* (СДФГ), *пайсці за Абрама замуж* (СДФГ), *пайсці да Абрама гавечкі пасвіць* (Fed.), *пайсці да Абрама на піва* (Fed.), *пойты в хвошчыны* (ЖНС-2001), *пойті на Выхторову гору* (НС). Вобраз смерці, які ляжыць у аснове другаснай намінацыі, не з’яўляецца грубым і не выклікае непрывабных асацыяцый.

Даволі вялікі ў беларускай мове пласт анамастычных фразеалагізмаў-эўфемізмаў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай завуаліраваць значэнне ‘напіцца, быць п’яным’: *як Валера Вацеў* (КФСГ), *з Лейзарам прывітацца (бачыцца)* (Fed., Высл.), *напіцца (набрацца) як (шчо) (тая) бэля (бэйля)* (СДФГ, Зайка, НС), *як Бронька Станілкава* (КФСГ). Такога роду эўфемістычныя фразеалагізмы І. У. Мілева называе «маскіровачнымі». Яны выкарыстоўваюцца з мэтай «прадухіліць камунікатыўны канфлікт, не стварыць для суразмоўцы пачуцця дыскамфорту» [14, с. 8].

Разнавіднасцю маскіровачных фразеалагізмаў з’яўляюцца табуіраваныя назвы хвароб, мэта якіх, паводле вызначэння Б. А. Ларына, заключаецца ў «зацямненні, прыкрыцці непрывабных з’яў жыцця» [15, с. 110]. Напрыклад, у выразах *Аляксей спарваў (схапіў)* ‘хто-н. хварэе на панос’ (ЗНФ) і *Аляксей праняў* ‘захворванне страўніка, парушэнне стрававання’ (Янк. ДС-3) антрапонім *Аляксей* з’яўляецца псеўдаўласным імем, утвораным ад дыялектнага апелятыва польскага паходжання *лякса* ‘панос’ (пол. *laksa*) [11, с. 42]. Прывядзём яшчэ некалькі падобных прыкладаў: *антонаў агонь* ‘заражэнне крыві, гангрэна’ (СФ-1, Раст., Высл.), *дзядзька Апанас пастукаўся* ‘хто-н. захварэў на панос’ (БД-2010), *ехаць (паехаць) на Рыгу* ‘ванітаваць’ (ФСК), *з прусоў да Рыгі ездзіць* ‘ванітуе, калі п’яны’ (Fed.), *швыдкі Іван* ‘паслабленне страўніка’ (ЖНС-2001).

Адзначым выпадкі, калі з дапамогай эўфемістычных фразеалагізмаў называюць інтымныя дзеянні і з’явы, якія адносяцца да палавой сферы. Напрыклад, у фразеалагізме *нябожчык Ціхон бяду нарабіў* са значэннем ‘цяжарная дзяўчына не хоча прызнавацца, ад каго яна зацяжарыла’ (Fed.) экспрэсіўнасць каламбура ствараецца за кошт гукавога збліжэння ўласнага імя *Ціхон* і апелятыва *ціхі*. Выраз *Вавілён зарос* са значэннем ‘у каго-н. страцілася палавая актыўнасць’ (БД-2010) узнік у выніку пераасэнсавання біблійнага сюжэта, звязанага з вавілонскім стоўпатварэннем. На думку М. А. Даніловіча, на развіццё выразу таксама аказаў уплыў фразеалагізм *вавілонская блудніца* са значэннем ‘вельмі разбэшчаная, распусная жанчына’ [11, с. 43].

У якасці эўфемістычных замяняльнікаў зафіксаваны нейтральныя перыфразы са значэннем ‘дурны, неразумны чалавек’: *ці дурны ці з Едзіч* (ППФВ), *ці з Монькаўцаў ці з Баяраў* (КФСГ), *з Наві-*

*нак* (КФСГ), *з Мэштавіч уцёк* (СДФГ). Тапонімы ў прыведзеных прыкладах з'яўляюцца назвамі вёсак, дзе знаходзяцца псіхіятрычныя бальніцы.

Такім чынам, выкарыстанне псеўдаўласных імёнаў з мэтай «кадзіравання» выразаў, якія могуць выклікаць адмоўную эмацыянальную рэакцыю, з'яўляецца агульнамоўнай заканамернасцю [10, с. 141].

Пры другасным фразеаўтварэнні, або ўнутраным фразеаўтварэнні (А. М. Ермакова), другаснай транспазіцыі (Ю. А. Гваздароў), унутрыфразеалагічным спосабе ўтварэння фразеалагізмаў (І. Я. Лепешаў), выразы будуюцца на аснове ўжо існуючых фразеалагізмаў [2, с. 13]. Як адзначае А. М. Ермакова, фразеалагізмы, якія ўзніклі ў выніку ўнутранага фразеаўтварэння «знаходзяцца ў адносінах фармальна-структурнай і семантычнай вытворнасці з зыходнымі выразамі» [16, с. 11]. Такі тып фразеаўтварэння ажыццяўляецца некалькімі спосабамі: дэрывацыяй, кантамінацыяй і мадэляваннем.

У межах унутрыфразеалагічнага спосабу ўтварэння фразеалагізмаў І. Я. Лепешаў і Л. М. Якшук вылучалі ўтварэнне назоўнікавых выразаў ад дзеяслоўных шляхам усячэння дзеяслоўнага кампанента [4, с. 27; 9, с. 114]. Як заўважыў І. Я. Лепешаў, «"абломак" дзеяслоўнага выразу захоўвае "долю" семантыкі ўсяго фразеалагізма» [4, с. 27]: *надзець (прымерыць) шапку Манамаха* 'стаць адзіным, поўнаўладным кіраўніком дзяржавы' (СФ-2) – *шапка Манамаха* '1) галаўны ўбор як сімвал царскай улады ў Расіі; 2) адзінае, поўнаўладнае кіраўніцтва дзяржавай' (СФ-2); *секчы (сячы) гордзіеў вузел* 'смела і рашуча вырашаць якія-н. цяжкасці, супярэчнасці' (СФ-2) – *гордзіеў вузел* 'заблытаная справа, складаныя абставіны' (СФ-1). Змена катэгарыяльнага статусу фразеалагізма дае падставы гаварыць пра ўтварэнне новага выразу.

Спосабам фразеалагічнай кантамінацыі – аб'яднання частак двух фразеалагімаў у адзін [4, с. 26], «змешвання, узаемапранікнення, гібрыдызацыі асобных фразеалагічных адзінак і іх кампанентаў» [11, с. 58] – утвораны фразеалагічны дыялектызм з кампанентам-аронімам *звесці з панталыку* (СГВ) (параўн. *звесці з тропу* (СБНФ), *збіць з панталыку* (СДФГ)). Такі тып кантамінацыі А. А. Алтыбаеў услед за Л. І. Райзензонам называе аплікацыяй, сутнасць якой заключаецца ў перакрыжаванай субстытуцыі кампанентаў, «у накладанні аднаго фразеалагізма на іншы» [17, с. 120].

Адным са спосабаў утварэння анамастычных фразеалагізмаў з'яўляецца мадэляванне – «стварэнне новых выразаў па гатовай мадэлі на ўзор тых, якія ўжо ёсць у мове» [4, с. 25]. Як паказвае прыклад з СДФГ, дыялектны выраз як *у Нёман кануў* 'прапаў, знік, не паяўляецца куды-н.' быў створаны па мадэлі фразеалагізма *як (нібы, што) у ваду кануў* 'нечакана прапаў, знік': *Як пашла замуш, ні разочку дахаты ні было, як у Нёман канула* (в. Гудзевічы Мастоўскага р-на). У структуры фразеалагізма *каб яно возерам стала!* 'выказванне пачуцця незадаволенасці, роспачы, адчаю і пад.' кампанент *возерам* заменены лімнонімам *Кроманню*, у выніку чаго ўзнік выраз *каб яно Кроманню стала (правалілася)* (СДФГ): *Бывало, чалавек недаволен, то скажа: каб яно* ***Кроманю правалілася*** (в. Балотца Навагрудскага р-на). Тут замена традыцыйных кампанентаў фразеалагізма ўласнымі назвамі адбываецца для ажыўлення вобразнай асновы выразу, узмацнення яго экспрэсіўнасці, а таксама ўтварэння мясцовага каларыту. Падобныя замены знаходзім і ў наступных прыкладах, дзе замест агульнага назоўніка *гара* выкарыстаны мясцовыя састаўныя мікратапонімы *Дамянішкаўская гара*, *Лысая гара* з мэтай «ажыўлення ўнутранай формы фразеалагізма» [18, с. 230]: *як рак на гары свісне – як рак на Дамянішкаўскай гары свісне*; *як рак на Лысай гары засвішча* (СДФГ) 'ніколі ці невядома калі' (*І калі ўжэ, Толічак, я на тваём вяселі трохо тупну? – А во* ***як рак на Дямянішкаўскуй гарэ сьвісьня,*** *тады начынайця грошы на падарак зьбірраць*; *Ну, калі ш ты жаніцца, Рысёк, думаіш? – А знаіш, цёця Гэня,* ***як рак на Лысай гары засьвішча,*** *тады адразу буду жаніцца* (в. Навасяды Ашмянскага р-на; СДФГ)).

Прадстаўнічай у анамастычнай фразеалогіі беларускай мовы з'яўляецца структурна-сінтаксічная схема, у межах якой фразеалагізмы рэалізуюць значэнне 'зусім не (зарабіць)': *(зарабіць) як Аўгуст на петушках* (СГВ), *(зарабіць) як Даніла на лісічках*, *як Меер на Кузьме* (Высл.), *як Мацей на яйках* (КФСГ), *як Саўка на барсуку* (СМН), *што (як) Хама на воўне* (Высл.), *як Хама на вайне* (Ройз.), *як Марцэля на цыбулі* (Высл.). Значэнне 'без толку, без справы (хадзіць)' перадаецца выразамі і іх варыянтамі *як Дара з Ваняю* (КФСГ), *як Валуй з Разаляю* (КФСГ), *як Мірон з Чычырындаю* (Зайка), *як Саўка з рэшатам* (КФСГ), *як поп (Хомка) з балалайкаю* (НМ).

Эліптычны спосаб утварэння фразеалагізмаў грунтуецца на скарачэнні прыказак, што з'яўляецца «адной з праяў прынцыпу моўнай эканоміі, які ўласцівы ўсім узроўням мовы» [19, с. 99]. У навуковай літаратуры сустракаем таксама тэрміны «фразеалагічная рэдукцыя» (Ю. А. Гваздароў), «згушчэнне думкі» (А. А. Патабня), «імпліцытнасць» (В. М. Макіенка).

Аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што фразеалагізмы з уласным імем могуць утварацца ў выніку скарачэння другой часткі прыказкі, «якая фактычна з'яўляецца сродкам канкрэтызацыі, расшыфроўкі папярэдняга вобраза або паказвае на вынік таго, пра што гаворыцца ў першай прыказкавай частцы» [20, с. 60]. Так, фразеалагізм *хітрук Змітрук* (Fed.) утварыўся ад прыказкі *Хіцёр Зміцёр (хітрук Змітрук), але і Саўка не дурак* у выніку адпадзення паясняльнай часткі. Аналагічным споса-

бам утварыліся і адпрыказкавыя фразеалагізмы *на святыя (на свентыя) Мігды* 'невядома калі; ніколі' (СДФГ) (з прыказак *На святыя Мігды, што не бываюць нігды*; *На святыя (свентыя) Мігды, а можа і (альбо, або, або і) нігды*), *як Дашкавіча бычок* 'нязграбна, няўдала' (СДФГ) (з прыказкі *Як Дашкавіча бычок – тылам, тылам і ў студню*). У выніку скарачэння прыказкі *Не адзін Гаўрыла (Гаўрылька) <што> ў Полацку* 'хто-н. ці што-н. не з'яўляецца адзіным прадметам размовы' ўзнік фразеалагізм *Гаўрыла з Полацка* (Fed., ПП). Вобразная аснова прыказкі *Бойцеся данайцаў, што прыносяць дарункі* стала дэрывацыйная базай фразеалагізма *данайскія дарункі (дары)* 'каварная паслуга з мэтай прычыніць зло' (СФ-1).

Такім чынам, анамастычная фразеалогія беларускай мовы ўвесь час колькасна і якасна ўзбагачаецца. Найбольш прадуктыўным спосабам утварэння ўстойлівых выразаў з уласным імем з'яўляецца першаснае фразеаўтварэнне, у межах якога вылучаюцца фразеалагічна-сінтаксічны (на аснове сінтаксічных адзінак) і фразеалагічна-лексічны (на базе асобных слоў) спосабы. Метафарычнае і метанімічнае пераасэнсаванне свабодных словазлучэнняў, стварэнне эўфемізмаў і каламбураў – асноўныя спосабы ўзбагачэння фразеалагічнага складу мовы. Пры другасным фразеаўтварэнні назіраюцца структурна-семантычныя мадыфікацыі фразеалагізмаў. У межах унутрыфразеалагічнага спосабу вылучаюцца дэрывацыя, мадэляванне і кантамінацыя. Анамастычныя фразеалагізмы могуць узнікаць і ў выніку эліпсацыі – скарачэння прыказак, што тлумачыцца імкненнем да эканоміі маўленчых сродкаў.

## Скарачэнні

**БД-2010** – Беларуская дыялекталогія: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. / рэдкал.: В. М. Курцова [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2010; **БНП** – *Янкоўскі Ф.* Беларускія народныя параўнанні. Мінск : Выш. шк., 1973; **Выcл.** – Выслоўі / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1979; **Горл.-1975** – *Горленка В.* З гаворак Гомельшчыны // Полымя. 1975. № 9. С. 248–251; **ЖНС-2001** – Жывое наша слова : дыялектал. зб. (да 90-годдзя чл.-кар. НАН Беларусі Ю. Ф. Мацкевіч) / пад рэд. Л. П. Кунцэвіч, І. Я. Яшкіна. Мінск : Беларус. навука, 2001; **Зайка** – *Зайка А.* Прыказкі і прымаўкі, жарты і каламбуры, прыгаворкі і языкаломкі, вясельныя прыгаворы пры дзяльбе каравая, вітанні і зычэнні, ветлівыя і ласкавыя выразы, засцярогі і прысяганні, праклёны і адкляцці, жартоўныя праклёны і дражнілкі-кепікі, зневажанні і параўнанні, прыкметы народнага календара з Косаўшчыны. Мінск : Тэхналогія, 2015; **ЗНФ** – *Лепешаў І. Я.* З народнай фразеалогіі : дыферэнц. слоўнік. Мінск : Выш. шк., 1991; **КФСГ** – Картатэка «Фразеалагічнага слоўніка гаворак Гродзеншчыны», складзеная М. А. Даніловічам; **Ков**. – Кароткая інструкцыя па зборы фразеалогіі ў беларускіх гаворках (па курсе «Дыялекталогія» для студэнтаў 2-га курса спецыяльнасцей «Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура» і «Руская мова і літаратура») / склад. У. І. Коваль. Гомель, 1979; **НКАМ** – Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіч. Мінск : Выд-ва БДУ; 1983; **НМ** – *Юрчанка Г. Ф.* Народнае мудраслоўе : слоўнік. Мінск : Беларус. навука, 2002; **НС** – Народныя скарбы : дыялектал. зб. (да 80-годдзя А. А. Крывіцкага) / пад рэд. Л. П. Кунцэвіча. Мінск : Права і эканоміка, 2008; **ПП** – Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / рэдкал.: А. С. Фядосік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. Кн. 1–2; **ППФВ** – *Сцяшковіч Т. Ф.* Прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы, выслоўі народных гаворак Гродзенскай вобласці. Гродна : ГрДУ, 1968; **Рап.** – Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / склад. Я. Рапановіч. 2-е выд., перапрац. і дап. Мінск : Выш. шк., 1974; **Раст.** – *Расторгуев П. А.* Словарь народных говоров Западной Брянщины: материалы для истории словарного состава говоров / под ред. Е. М. Романович. Минск : Наука и техника, 1973; **Ройз.** – *Ройзензон Л. И., Балясникова А. В., Шугурова З. А.* Словарь белорусской диалектной фразеологии деревни Гребени (Лельчицкого района Гомельской области) // Тр. Самарканд. ун-та. Вопр. Фразеологии. 1975. Вып. 272, № 8. С. 67–81; **СБНФ** – *Мяцельская Е. С., Камароўскі Я. М.* Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі. Мінск : Выд-ва БДУ, 1972; **СГВ** – *Сцяшковіч Т. Ф.* Слоўнік Гродзенскай вобласці. Мінск : Навука і тэхніка, 1993; **СДФГ** – *Даніловіч М. А.* Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны. Гродна : ГрДУ, 2000; **СМН** – *Ліцвінка В. Д., Царанкоў Л. А.* Слова міма не ляціць: беларускія народныя прыказкі і прымаўкі. Мінск : Універсітэцкае, 1985; **СФ-1** – *Лепешаў І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2008. Т. 1; **СФ-2** – *Лепешаў І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2008. Т. 2; **ФС** – *Гаўрош Н. В., Лепешаў І. Я., Янкоўскі Ф. М.* Фразеалагічны слоўнік: для сярэдняй школы. Мінск : Нар. асвета, 1973; **ФСК** – *Зайка А.* Фразеалагічны слоўнік. Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2014; **ЭСФ** – *Лепешаў І. Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2004; **Юрч.-1974** – *Юрчанка Г. Ф.* І сячэ і паліць: устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны / пад рэд. А. А. Крывіцкага. Мінск : Навука і тэхніка, 1974; **Янк. ДС-3** – *Янкоўскі Ф.* Дыялектны слоўнік. Вып. 3. Мінск : Навука і тэхніка, 1970; **Янк.-1979** – *Янкоўскі Ф., Тамашэвіч Т., Аляхновіч М.* Яшчэ з народнай фразеалогіі // Слова, фразеалагізм і кантэкст : зб. арт. / пад рэд. Ф. Янкоўскага. Мінск, 1979. С. 42–57; **Fed**. – *Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Warszawa : Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1935. T. 4.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Амосова НН. Значение фразеологии как особой отрасли языкознания. В: Попов РН, редактор. *Проблемы фразеологии и задачи ее изучения в высшей и средней школе. Доклады конференции*. Вологда: Северо-западное книжное издательство; 1967. с. 5–12.

2. Коваль ВИ. *Образование фразеологических единиц и фраземообразовательный анализ* [автореферат диссертации]. Минск: Белорусский государственный университет; 1982.

3. Гвоздарев ЮА. *Основы русского фразообразования*. Ростов-на-Дону: Издательство Ростовского университета; 1974.

4. Лепешаў ІЯ. *Фразеалогія сучаснай беларускай мовы*. Мінск: Вышэйшая школа; 1998.

5. Жуков ВП., Жуков АВ. *Русская фразеология*. Москва: Высшая школа; 2006.

6. Лепешаў ІЯ. *Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы*. Мінск: Навука і тэхніка; 1984.

7. Зимин ВИ. К вопросу об образовании фразеологизмов из числа свободных словосочетаний. *Вопросы стилистики русского языка. Труды Университета дружбы народов имени П. Лумумбы*. 1972;58(8):80–91.

8. Лепешаў ІЯ. *Чаму мы так гаворым*. Гродна: ГрДУ; 2003.

9. Якшук ЛМ. *Назоўнікавыя фразеалагізмы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.* Лепешаў ІЯ, рэдактар. Гродна: ГрДУ; 2008.

10. Коваль ВИ. *Фразеология народной духовной культуры: состав, семантика, происхождение.* Минск: РИВШ; 2011.

11. Даніловіч МА. *Слова і фразеалагізм у беларускай мове*. Гродна: ЮрСаПрынт; 2015.

12. Москвин ВП. Эвфемизмы: системные связи, функции и способы образования. *Вопросы языкознания.* 2001;3:58–70.

13. Арсентьева ЮС. Сигнификативно-денотативный компонент значения фразеологизмов-эвфемизмов английского и русского языка. *Филология и культура*. 2012;1:5–8.

14. Мілєва ІВ. *Матеріали до евфемістичного фразеологічного словника східнослобожанських і східностепових говірок.* Луганськ: Альма-матер; 2010.

15. Ларин БА. Об эвфемизмах. В: Богородский БА, Мещерский НА, составители. *История русского языка и общее языкознание.* Москва: Просвещение; 1977.

16. Ермакова ЕН. *Фразо- и словообразование в сфере фразеологии* [автореферат диссертации]. Тюмень: Челябинский государственный университет; 2008.

17. Алтыбаев АА. К изучению природы фразеологической контаминации. *Труды Самаркандского университета имени А. Навои. Новая серия. Вопросы фразеологии.* 1976;10:110–122.

18. Даніловіч МА. *Беларуская дыялектная фразеалогія і яе лексічная аснова.* Гродна: ГрДУ; 2003.

19. Мокиенко ВМ. *Славянская фразеология.* 2-е издание, исправленное и дополненное. Москва: Фолио-Пресс; 1989.

20. Лепешаў ІЯ. *Парэміялогія як асобны раздзел мовазнаўства*. Гродна: ГрДУ; 2006.

## References

1. Amosova NN. [The meaning of phraseology as a special branch of linguistics]. In: Popov RN, editor. *Problemy frazeologii i zadachi ee izucheniya v vysshei i srednei shkole. Doklady konferentsii* [Problems of phraseology and the tasks of its study in higher and secondary schools. Conference reports]. Vologda: Severo-zapadnoe knizhnoe izdatel'stvo; 1967. p. 5–12. Russian.

2. Koval' VI. *Obrazovanie frazeologicheskikh edinits i frazemoobrazovatel'nyi analiz* [Formation of phraseological units and phraseological analysis] [dissertation abstract]. Minsk: Belarusian State University; 1982. Russian.

3. Gvozdarev YA. *Osnovy russkogo frazoobrazovaniya* [Basics of Russian phraseologism formation]. Rostov-on-Don: Publishing House of Rostov University; 1974. Russian.

4. Lepeshaw IY. *Frazealogija suchasnaj belaruskaj movy* [Phraseology of the modern Belarusian language]. Minsk: Vyshjejshaja shkola; 1998. Belarusian.

5. Zhukov VP, Zhukov AV. *Russkaya frazeologiya* [Russian phraseology]. Moscow: Vyshjejshaja shkola; 2006. Russian.

6. Lepeshaw IY. *Prablemy frazealagichnaj stylistyki i frazealagichnaj normy* [Problems of phraseological stylistics and phraseological norm]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1984. Belarusian.

7. Zimin VI. [To the question of formation of phraseological units from free phrases]. In: *Voprosy stilistiki russkogo yazyka. Trudy universiteta Druzhby narodov imeni P. Lumumby* [Questions stylistics of the Russian Language. Proceedings of the Patrice Lumumba University of Peoples' Friendship]. 1972;58(8):80–91. Russian.

8. Lepeshaw IY. *Chamu my tak gavorym* [Why do we talk like that]. Hrodna: HrSU; 2003. Belarusian.

9. Yakshuk LM. *Nazownikavyja frazealagizmy w suchasnaj belaruskaj litaraturnaj move* [Nouna phraseological units in the modern Belarusian literary language]. Hrodna: HrSU; 2008. Belarusian.

10. Koval' VI. *Frazeologiya narodnoi dukhovnoi kul'tury: sostav, semantika, proiskhozhdenie* [Phraseology of folk spiritual culture: composition, semantics, origin]. Minsk: NIHS; 2011. Russian.

11. Danilovich MA. *Slova i frazealagizm u belaruskai move* [Word and idiom in the Belarusian language]. Hrodna: JurSaPrynt; 2015. Belarusian.

12. Moskvin VP. [Euphemisms: system connections, functions and methods of formation]. *Voprosy yazykoznaniya* [Topics in the study of language]. 2001;3:58–70. Russian.

13. Arsent'eva YS. [Significative-denotative component of the meaning of phraseological units-euphemisms of the English and Russian languages]. *Philology and culture.* 2012;1:5–8. Russian.

14. Mileva IV. *Materiali do evfemistichnogo frazeologichnogo slovnika shidnoslobozhans'kih i shidnostepovih govirok* [Materials for phraseological vocabulary of euphemisms of eastern slobozhanskiy and eastern steppe dialects]. Lugansk: Alma mater; 2010. Ukrainian.

15. Larin BA. [About euphemisms]. In: Bogorodskii BA, Meshcherskii NA, compilers. *Istoriya russkogo yazyka i obshchee yazykoznanie* [History of the Russian language and general linguistics]. Moscow: Prosveshchenie; 1977. Russian.

16. Ermakova EN. *Frazo- i slovoobrazovanie v sfere frazeologii* [Phraseologism and word formation in phraseology] [dissertation abstract]. Tyumen: Chelyabinsk State University; 2008. Russian.

17. Altybaev AA. [To the study of nature of phraseological contamination]. In: *Trudy Samarkandskogo universiteta imeni A. Navoi. Novaya seriya. Voprosy frazeologii* [Proceedings of A. Navoi Samarcand State University. New series. Quastions of the phraseology]. 1976;10:110–122. Russian.

18. Danilovich MA. *Belaruskaja dyjalektnaja frazealogija i jae leksichnaja asnova* [Belarusian dialectal phraseology and its lexical base]. Grodna: HrSU; 2003. Belarusian.

19. Mokienko VM. *Slavyanskaya frazeologiya* [Slavic phraseology]. 2nd edition, supplemented. Moscow: Folio-Press; 1989. Russian.

20. Lepeshaw IY. *Parjemijalogija jak asobny razdzel movaznawstva* [Paremiology as a separate branch of linguistics]. Hrodna: HrSU; 2006. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 27.06.2018.*
*Received by editorial board 27.06.2018.*